Вескі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: e-krama.com, pahonia.com
Электронны адрас: viestki@mail.com
P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 5 (591)
Травень 2015 г.

Сьвяткаваньне Дня Волі ў Нью-Брансўіку

Сёлета сьвята 25-га Сакавіка – Дзень Волі й 97-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі – было супольна адзначанае Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем (БАЗА) у Нью-Джэрзі й Беларуска-Амэрыканскім Згуртаваньнем "Пагоня" 29-га сакавіка ў Нью-Брансўіку, Нью-Джэрзі. У царкве сьв. Маці Божае Жыровіцкае Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Гайленд-Парку ля Нью-Брансўіка сьвятаром а. Зіновім была адпраўленая імша за Беларусь і беларускі народ. Сьвятар павіншаваў усіх беларусаў з нацыянальным сьвятам, і адзначыў, якую вялікую дапамогу аказваюць беларусы ў гэтыя цяжкія для Ўкраіны дні братам-украінцам.

У прыгожым гатэлі Гаят-Рыджэнсі ў Нью-Брансўіку адбыліся ўрачыстая акадэмія, сьвяточны банкет і канцэрт.

Напачатку імпрэзы прагучэў амэрыканскі гімн у эмацыйным выкананьні сп-ні Вольгі Казак-Анлар. Першым слова ўзяў сп. Юрка Азарка, старшыня аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі. Ад імя сяброў аддзелу сп. Азарка павіншаваў прысутных зь беларускім нацыянальным сьвятам 25-га Сакавіка, пажадаў добрага здароўя і сілаў для працы на карысьць беларускай грамады і Бацькаўшчыны. Ён адзначыў, што цяпер для Беларусі наступаюць выпрабавальныя часы, і ад усіх беларусаў, у тым ліку і ад тых, што знайшліся далёка ад Бацькаўшчыны, неабходная еднасьць і супрольная праца.

Старшыня Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" Віталь Зайка прачытаў прысутным прывітаньне, якое даслала Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла. Ён таксама прывітаў прысутных ад імя Згуртаваньня "Пагоня", падкрэсьліў неабходнасьць мацаваньня салідарнасьці беларускіх сілаў і пераадоленьня закалотаў і непаразуменьняў. Затым сп. Сьветавітам Сакалавым быў прачытаны па-ангельску тэкст 3-й Устаўнай граматы Рады БНР ад 25 Сакавіка 1918 г., што абвесьціў незалежнасьць Беларусі і вызначыў яе як вольную рэспубліку ў беларускіх этнаграфічных межах. У міжчасе ўдзельнікі імпрэзы маглі пакаштаваць страваў буфэту ды выпіць віна і чаго мацней за найгалоўнае беларускае нацыянальнае сьвята, памянуць беларускіх змагароў, "што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына".

Затым сп. Ю. Азарка прачытаў прывітаньне ад кангрэсмэна ад штату Нью-Джэрзі сп. Фрэнка Пэлоўна. У ім сп. Пэлоўн павіншаваў беларусаў з нацыянальным сьвятам, адзначыўшы, што ягоная сям'я таксама мае сувязі зь Беларусьсю:

працяг на бачыне 2



Красавіцкі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу, 11 красавіка, у Доме Маракоў на Мангэтане адбыўся чарговы сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу выступіў старшыня “Пагоні” Віталь Зайка з кароткім паведамленьнем пра апошнія падзеі ў жыцьці арганізацыі, зрабіў аб’явы. Затым ён даў кароткі агляд апошніх падзеяў, зьвязаных зь Беларусьсю, у тым ліку ў сьвятле падзеяў ва Ўкраіне і нечуванага, разгубленага стаўленьня краінаў Вольнага Сьвету, у тым ліку ЗША, да расейскай аргэсіі.

Прамоўца адзначыў, што верагоднасьць разьвіцьця падзеяў па сцэнары, які Расея скарыстала для захопу Крыму, надзвычай высокая і для Беларусі. Нягледзячы на тое, што Лукашэнка напоўніцу скарыстаў мажлівасьці для зьмяншэньня ізаляцыі Беларусі, у якую ён завёў краіну ў выніку сваёй аўтарытарнай антынацыянальнай палітыкі, небясьпека збоку Расеі застаецца праблемай нумар адзін. Але пры ўсім гэтым нават цяпер Лукашэнка бачыць нацыянальныя сілы сваім найвялікшым ворагам, большым чым расейскі імпэрыялізм, які ў кожны зручны момант можа выбіць дыктатара зь ягонага кіраўнічага крэсла. Дзеячы апазыцыі дасюль перасьледуюцца і застрашваюцца, культурніцкія дзеячы адзначаюць штораз, як улады звужаюць мажлівасьці працы на глебе нацыянальнай, як прымусова зачыняюцца беларускія



Віталь Зайка

кнігарні, канфіскуюцца выданьні па-беларуску. І ў гэты самы час па Беларусі гайсаюць незразумелыя асобы ў кубанках і з аўтаматамі-калашнікамі, якім невядома хто, з блаславеньня Расейскай Праваслаўнай Царквы ў Беларусі, даручыў “патрыятычнае выхаваньне”!

Сп. В. Зайка таксама спыніўся на падрыхтоўцы да прэзыдэнцкіх выбараў сёлета ў Беларусі і адзначыў, што наўрад ці хто спадзяецца на зьмену кіруючай асобы. У пэўнай ступені гэта ёсьць хібай таксама і апазыцыі, якая каторы ўжо раз ня мае адзінага скаардынаванага сцэнару правядзеньня супольнай палітыкі што да выбараў і высоўваньня адзінага кандыдата або прынятага ўсімі байкоту. Нажаль, цяпер няма як спадзявацца і на дапамогу ці нават увагу збоку ўраду Злучаных Штатаў – у выніку той бездапаможнай і некампэтэнтнай зьнешняй палітыкі, якая праводзіцца адміністрацыяй прэзыдэнта Абамы. Таму цяпер беларуская салідарнасьць, яднаньне сілаў ёсьць хіба ці не адзіным сродкам супрацьстаяньня як дыктатуры, так і пагрозе расейскай агрэсіі.

У другой частцы парадку дня было чытаньне вершаў, у тым ліку перакладаў з расейскай клясыкі на беларускую мову у выкананьні сп. Віталя Зайкі. Сп. Віктар Едзіновіч і сп. Зьміцер Левіт прадэклямавалі вершы Максіма Багдановіча.

У разьдзеле Рознае адбыліся спробы знаёмства з гасьцямі Згуртаваньня “Пагоня”.

Віталь ЗАЙКА

Імпрэза ў Нью-Брансўіку

працяг з бачыны 1

швагерка сп. Пэлоўна – беларускага паходжаньня, а нявестка нарадзілася ў Беларусі. Кангрэсмэн падкрэсьліў, што разам з калегамі працягвае працу ў Кангрэсе, каб разьвіцьцё сытуацыі ў Беларусі заставалася ў полі зроку амэрыканскага грамадзтва і ягоных урадавых прадстаўнікоў, каб узьдзеяньне на рэжым Лукашэнкі падтрымлівалася і ўзмацнялася, з тым каб дапамагчы апазыцыйным сілам у змаганьні за дэмакратыю і супраць дыктатуры. “Беларусь можа і хоча зрабіцца свабоднай і далучыцца да сям’і вольных народаў – і ёй неабходна дапамагчы ў гэтым”.

Трыё сям’і Казак у складзе Валянціны Пархоменкі, Алеся Казака і Вольгі Казак-Анлар засьпявалі патрыятычныя песьні: “Пагоню” на словы М. Багдановіча і песьню “Белая-Белая”.

Затым выступіў Старшыня Беларускага Народнага Фронту і Партыі КХП-БНФ сп. Зянон Пазьняк. Ён павіншаваў прысутных з найвялікшым для ўсіх беларусаў нацыянальным сьвятам і адзначыў, што менавіта сьвяткаваньне ўгодкаў незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі ёсьць сваеасаблівым момантам, калі думкі кожнага беларуса мусяць быць скіраваныя да Бацькаўшчыны і ейнага лёсу. “Часы цяпер няпростыя, і менавіта ад нас, людзей што жывуць у гэтыя часы, залежыць, ці зможам захаваць незалежнасьць, ці здолеем адбіць

заканчэньне на бачыне 7



Трыё сям’і Казакоў

Падвоены генацыд

Падзеі Другой сусьветнай вайны нават цяпер, 70 год пасьля сканчэньня, яшчэ застаюцца ў Беларусі, як і наагул ва Ўсходняй Эўропе й на постсавецкім абшары, надзённымі й балючымі. І гэта асабліва відовочна ў сьвятле падзеяў ва Ўкраіне.

Калі ў 2014 годзе народ Украіны паспрабаваў скінуць хамут расейскай залежнасьці, прагнаў прэзыдэнта, што фактычна быў расейскай марыянэткай – адразу гэтае змаганьне за свабоду і незалежнасьць было сустрэтае рэкамі бруду і хлусьні ў расейскіх масавых сродках. Варта ўвагі, што яны амаль цалкам страцілі самастойнасьць і скрозь зрабіліся рупарам рэжыму Пуціна. Расейскія газэты, тэлебачаньне, сеціўныя выданьні й інтэрнэттролі хорам сталі называць прыйшоўшыя да ўлады ва Ўкраіне і непадкантрольныя Расеі сілы "фашыстамі", "бендэраўцамі", "нацыстамі", "гітлераўскімі недабіткамі". Сфармаваны ўрад Украіны стаў звацца ў іх не інакш як "хунта". І гэта ўжо мела прэцэдэнт у 2008 годзе, падчас расейскай агрэсіі супраць Грузіі, калі "фашыстамі" й "нацыстамі" сталі грузінскія патрыёты і прэзыдэнт М. Саакашвілі. Яшчэ раней, за савецкім часам, у "фашыстах" пабывалі праэзыдэнт ЗША Г. Труман і брытанскі прэм'ер Ў. Чэрчыль, францускі прэзыдэнт Ш. Дэ Голь і герой змаганьня супраць гітлераўцаў на Бальканах Ёсіп Броз-Ціта. У даваенны час "фашыстамі" ў Саветах прапаганда называла Троцкага і Бухарына. У савецкіх турмах і канцлягерох (у Гулагу) "фашыстамі" называліся ўсе, хто быў асуджаны па палітычных артыкулах крымінальнага кодэксу (артыкул 58 і адпаведныя нормы саюзных рэспублікаў з усімі выводнымі й далучнымі часткамі й параграфамі).

Такі чынам бачым, што ў Саветах і ў сёнешняй аўтарытарнай Расеі сэнс тэрміну "фашыст" – значыць не пасьлядоўнік нямецкага нацыянал-сацыялізму або італьянскага скрайне правага руху, узначаленага Мусаліні. Там "фашыст" быў і ёсьць – вораг, сапраўдны ці ўяўны, савецкага або пуцінскага рэжыму, якіх бы паглядаў ён не прытрымліваўся, і якой нацыянальнасьці б ні быў. Больш таго, калі паглядзець у слоўніку дакладную дэфініцыю слова "фашызм", а менавіта: "сыстэма дзяржкіраваньня праз жорсткую аднапартыйную дыктатуру, сілавое падаўленьне апазыцыі, цэнтралізаваны кантроль эканомікі, ваяўнічы нацыяналізм, расізм і мілітарызм" – можна пабачыць, што гэта як найлепей характэрызуе менавіта савецкі й цяперашні расейскі стыль кіраваньня. Але такая магія словаў і мастацтва прапаганды, што амаль усё насельніцтва Расеі, большасьць расейскамоўных па сьвеце і шмат хто з "карысных ідыётаў" у Вольным сьвеце з энтузіязмам падхапілі хлусьню і цэтлікі-абразы расейскай прапаганды.

У выпадку Ўкраіны асобнае і, бадай, цантральнае месца займае лаянка "бендэравец". Пад гэтым паняткам ва ўжываньні расейцамі і ўкраінафобамі маецца на ўвазе "крыважэрны паслугач гітлераўскіх акупантаў", што "лізаў боты немцам і забіваў мірных суайчыньнікаў, адпрацоўваючы свае 30 сярэбраньнікаў", ці нешта блізка падобнае. Між тым ці быў сапраўдны "Бендэра", гэта значыць герой украінскага нацыянальна-вызвольнага руху Сьцяпан Бандэра, насамрэч "боталізам" у немцаў і забойцам мірных суайчыньнікаў? Гістарычныя досьледы і дакумэнтацыя паказваюць, што С. Бандэра меў на мэце дасягненьне дзяржаўнай незалежнасьці Ўкраіны і прагматычна карыстаў з супярэчнасьцяў паміж тагачаснымі сіламі, што вырашалі лёсы Ўкраіны – Намеччынай, Польшчай, Саветамі. З усіх іх Саветы займалі найбольш брутальную пазыцыю непрыняцьця ўкраінскага нацыянальнага руху і, натуральна, ніяк не маглі быць уважаныя за сябра Ўкраіны. Нямеччына, наадварот, прапаноўвала садзеяньне й дапамогу, як дапамагалі, у меншай ступені, Чэхаславаччына і Францыя. Але ў выніку падзеяў 1939-41 гг., калі Бандэра выйшаў на волю з польскай турмы, менавіта Нямеччына засталася адзінай рэальнай сілай, што магла быць у прынцыпе скарыстаная для змаганьня супраць Саветаў, пад панаваньнем якіх апынулася ўся Ўкраіна.

Прыпомнім сабе, што ўсяго за якіх 7-8 год перад тым Украіну спляжыў сталінскі Галадамор – штучна выкліканы голад, мільёны загінулі страшнай павольнай сьмерцю. Пасьля таго новыя мільёны пайшлі ў турмы і на высяленьне, на Поўнач і ў Сібір, як "кулакі". Тысячы прадстаўнікоў украінскай інтэлегенцыі былі расстраляныя, дзясяткі й сотні тысяч апынуліся ў Гулагу. Сталін паставіў задачу паскоранай русіфікацыі. У захопленай Саветамі Заходняй Украіне пачалі таксама жорстка вынішчаць усе структуры і любыя парасткі ўкраінскага нацыянальнага руху, а нават найменшыя праявы ўкраінскай нацыянальнай сьведамасьці, якія ўспрымаліся як пагроза расейскаму камуністычнаму панаваньню. Пры гэтым трэба дадаць, што падобны лёс напаткаў і беларусаў – у іх таксама, хоць і ў непараўнальна меншай ступені, але быў Галадамор у 1930-я, былі тысячы ахвяраў. Было вынішчэньне нацыянальнай інтэлегенцыі, нават хіба больш сыстэматычнае і брутальнае, былі масавыя расстрэлы, турмы і Гулаг.

І вось у гэткай сытуацыі ўкраінскія нацыянальныя дзеячы сустрэлі дзень нападу Нямеччыны на Саветы. Большасьць зь іх, як і большасьць усіх украінскіх людзей, вітала вызваленьне ад нялюдзкага камуністычнага рэжыму. На немцаў ускладаліся спадзяваньні на разгон калгасаў, аднаўленьне пашаны да рэлігіі, наагул, вяртаньне да годнага чалавечага жыцьця. Нацыянальныя дзеячы, а ў іх ліку Бандэра, верылі ў стварэньне незалежнай або хоць часткова незалежнай Украіны пад нямецкім пратэктаратам. Натуральным прыкладам былі Славакія й Харватыя, што атрымалі незалежнасьць і ўсе атрыбуты сувэрэнітэту дзякуючы менавіта немцам. У першыя дні вайны ў Львове была абвешчаная незалежная Ўкраіна і сфармаваны яе ўрад. Але ўжо ў хуткім часе немцы далі зразумець, што яны ня менш жорсткія й нялюдзкія захопнікі, чым бальшавікі.

Тыя першыя трагічныя дні незалежнасьці былі азмрочаныя пагромамі супраць гэбраяў, і гэты злачын і крымінальная безадказнасьць тых, што мусілі б не дазволіць узброеным і запаленым актывістам апусьціцца да зьверстваў супраць сваіх суграмадзянаў, кінула чорны цень на самое абвешчаньне незалежнасьці ў 1941 годзе, на датычных нацыянальных дзеячаў. Тут паўтарылася сытуацыя часоў Грамадзянскай вайны – за пагромы й рабункі гэбраяў вінаватым зрабілі ўрад Сымона Пятлюры, хоць ён імкнуўся спыніць пагромы і перакаканаць насельніцтва не чыніць зла гэбраям. Нажаль, уплыву і сілаў не ставала, і гэта менавіта паставілі пазьней у віну. Савецкая прапаганда падлівала масла ў вагонь, выстаўляючы ўкраінскіх нацыяналістаў грамілами й антысэмітамі. Але навука зь надаўняй мінуласьці не прыдалася. Украінскі нацыянальны рух не выступіў супраць варожасьці да іншых этнічных групаў ва Ўкраіне. Ды гэта да таго ж і цяжка было зрабіць пад нямецкай акупацыяй. Але Саветы зрабілі ўсё, каб скарыстаць хібы ў дзеяньнях паасобных дзеячоў і запляміць увесь украінскі рух, а галоўнае – кампрамэтаваць ідэю незалежнасьці Ўкраіны.

Безумоўна, украінскі рух ня быў маналітам, і сярод розных плыняў трапляліся розныя дзеячы. Але паўтарылася злая гіронія выпадку Пятлюры – з Бан-

Заканчэньне на бачыне 4

Заканчэньне з бачыны 3

дэрам, не без стараннай дапамогі савецкай і расейскай прапаганды, сталі асацыяваць тое, што сам ён не ўспрымаў і супраць чаго выступаў. Падкрэсьлена зьдзекліва назоў “бендэравец” вызначае, па задумцы расейскіх ідэялягічных дывэрсантаў, крыважэрнага вылюдка, апантанага ксэнафоба і антысэміта, што ня спыніцца перад забойствам дзяцей, старых і кабетаў.

Безумоўна, Сьцяпан Бандэра спадзяваўся на немцаў у справе геапалітычнай, але трэба ўспрымаць гэта ў кантэксьце тых часоў. З Саветамі ды іхнай партызанкай ніякая супраца не была мажлівай, бо тыя прызнавалі толькі цалкавітую капітуляцыю й падпарадкаваньне. З палякамі была падобная сытуацыя, і былі яшчэ добра ў памяці гвалты й нацыянальны прыгнёт часоў санацыі, што, дарэчы, выклікала ў вялікай меры трагічныя падзеі польска-ўкраінскага ўзаемнага бессэнсоўнага вынішчэньня на Валыні ў 1943-1944 гг. Такім чынам, Нямеччына заставалася адзінай сілай, на якую можна было, як тады здавалася, спадзявацца ў справе ўкраінскай незалежнасьці. Досыць хутка тыя ілюзіі разьвеяліся, і Бандэра быў арыштаваны немцамі, правёўшы амаль усю вайну ў канцлягеры Бухэнвальд. Шмат якія нацыяналісты былі расстраляныя, як паэтка Олена Тэліга і кіеўскае ўкраінскае нацыяналістычнае падпольле. Немцы таксама забівалі беларускіх нацыянальных дзеячаў, варта ўзгадаць хаця б сьмерць кс. В. Гадлеўскага. У гэты час, дарэчы, разгарнулася жорсткае змаганьне за дамінацыю ва ўкраінскім руху паміж фракцыямі Бандэры і Мельніка. І назоў “бандэраўцы” меў тады, канешне, зусім іншы сэнс.

Немцы, дзеля вар’яцкіх расавых тэорыяў і злачыннай практыкі вынішчэньня гэбраяў, а таксама дзеля абыякавасьці да жыцьцяў некамбатантаў у зонах вайсковых дзеяньняў і супрацьпартызанскіх акцыяў, нясуць большасьць цяжару адказнасьці за страты ва Ўкрїне, таксама як і ў Беларусі. Аднак савецкая партызанка таксама спрычынілася да таго, што ўзровень стратаў цывільнага насельніцтва быў такі высокі. Заплянавана і мэтанакіравана правакуючы немцаў на калектыўнае пакараньне мірнага насельніцтва за тэракты і забойствы партызанамі нямецкіх урадоўцаў і жаўнераў, савецкае кіраўніцтва мела дакладна акрэсьленую мэту – каб насельніцтва змушнае было далучацца да партызанаў, і каб кожны іншы, адрозны ад расейска-бальшавіцкага, варыянт дзяржаўнага кіраваньня быў назаўжды скампрамэтаваны.

Супраціў Саветам і Сталіну савецкая прапаганда па вызначэньні асацыявала зь нямецкімі захопнікамі й фашызмам. Маўляў, украінская незалежнасьць (а таксама незалежнасьць беларуская, летувіская, латыская) – гэта толькі адгаворка для таго, каб паслужыць немцам, каб пазьдзекавацца зь мірных савецкіх грамадзянаў. А ў выніку генацыд супраць украінцаў і беларусаў, а таксама народаў Балтыі, быў праведзены супольна нямецкімі нацыстамі й савецкімі камуністамі. Але нават заікнуцца пра гэта, параўнаць дзеяньні немцаў і Саветаў у пэрыяд вайны ўважалася за савецкім часам жудаснай крамолай і паклёпам. Няшмат што зьмянілася ў гэтым сэнсе і сёньня, асабліва ў Беларусі й Расеі, а таксама ў розных прарасейскіх або, апрацаваных расейскай прапагандай, групах насельніцтва па ўсіх землях постсавецкага абшару.

Бандэра ў рэшце рэшт зрабіўся сымболем украінскага нацыяналізму, сымболем змаганьня супраць бальшавізму за незалежную Ўкраіну. І менавіта дзеля гэтага за яго ўзяліся маскоўскія палітрукі. Усё было перакулена дагары нагамі, на ўкраінскіх нацыяналістаў пасыпаліся праклёны, што яны былі “саўдзельнікамі ў злачынствах”, “памагатымі акупантаў”, а пасья вайны – “агентамі сусьветнай буржуазіі”, “амэрыканскімі наймітамі”. Саветам трэба было як мага хутчэй выставіць у адмоўным сьвятле ўкраінскую ідэю, спляжыць волю ўкраінцаў да сваёй незалежнасьці. Саветы баяліся гэтай ідэі і баяліся Бандэры. Менавіта таму С. Бандэра і быў забіты ў Нямечыне. І вось тыя 70 год вынішчэньня, вытраўленьня ўкраінскасьці далі плён – сёньня на ўсходзе Ўкраіны яе грамадзяне, украінцы-манкурты з Данбасу і Луганску працягваюць са зброяй у руках справу былых НКВД і МГБ.

Усё гэта мае самы наўпросты уплыў і значаньне на цяперашнія падзеі ў Беларусі, дзе апаганьваецца магіла беларуса, што на Майдане стаў героем Украіны. Гэта мае наўпросты ўплыў і на будучыню Беларусі, таксама як і на будучыню Ўкраіны. Пакуль цалкам ня будзе сказаная і даведзеная да самах шырокіх колаў насельніцтва ўся праўда пра падвоены генацыд, датуль пуцінская прапаганда ня будзе мець эфэктыўнай супрацьвагі і не атрымае належнага адпору. А тыя, чыіх продкаў стагодзьдзямі вынішчалі расейскія цары і расейскія бальшавікі, застануцца “карыснымі ідыётамі” для рэваншысцкіх захопніцкіх плянаў Крамля.

Віталь ЗАЙКА



ДЗЕЛІМСЯ ВОПЫТАМ

У гасьцях у адвакаткі Юліі Елісеевай

На сёньняшні дзень сучасныя тэхналёгіі настолькі распаўсюджаныя, што людзі ня часта маюць жаданьне размаўляць “ужывую”. Калі ўзьнікае спрэчнае пытаньне, моладзь адказвае “google it!” і зьвяртаецца да інтэрнэту. Але раней досьвед “жывой” размовы зь людзьмі быў адною з надзейных крыніцаў інфармацыі, бо чалавечы вопыт немагчыма параўнаць зь ніякімі тэарытычнымі ведамі. Чалавек перажывае эмоцыі, сутыкаецца з рознымі выпадкамі і ў выніку набывае досьвед, які падказвае, як знайсьці выйсьце ў складанай сытуацыі. На сваёй працы я кожны дзень бачу новых людзей, і мне заўсёды цікава запытацца аб іхных захапленьнях. Нешта ўражвае, а нешта расчароўвае. А калі я сустракаю сваіх землякоў, то ўдвая больш задаю пытаньняў, як на сапраўдным допыце. Гэтым разам я распавяду вам аб маёй размове зь вельмі цікавай, пасьпяховай і добразычлівай **Юляй Елісеевай** (родам з Горадні). У Амэрыцы яна ўжо амаль 14 год. Прыехала сюды зь дзіцём на руках. Пасьпяхова скончыла Law School (юрыдычны факультэт) у City University of New York і ўжо больш за восем гадоў працуе адвакатам па іміграцыйных справах, таксама займаецца агульнай практыкай.

– Юля, скажыце, што Вам далося асабліва цяжка, калі вы прыехалі ў ЗША? Мова? Культура? Адаптацыя да клімату?

– Я не лічу, што мне было нешта асабліва цяжка. Я хутка адаптавалася да асяродзьдзя. З моваю я таксама хутка звыклася, таму што з ангельскай у мяне яшчэ са школы праблемаў не было. Магчыма, гэта дар Божы. Хоць мне вельмі запомніўся выпадак, калі ў першы тыдзень як я прыехала, я пайшла з сынам ў McDonald's, і мне было цяжка растлумачыць касіру, што я хачу замовіць бульбу фры. Я злавалася, што мяне не разумеюць, асабліва ў дробязях. Таму я заўсёды імкнуся зразумела тлумачыць, што мне патрэбна.

– На ваш погляд, з чаго варта пачынаць кожнаму беларусу, які толькі апынуўся тут? Ня ўлічваючы пошук жытла і працы.

– У першую чаргу трэба вызначыцца з прыярытэтамі ў жыцьці – зарабіць грошы або рабіць захады, каб легалізавацца і застацца тут. У Амэрыцы шмат магчымасьцяў, і трэба задумацца, якія выкарыстаць спачатку.

– Што было самым дзіўным або нечаканым, што здарылася з Вамі ў ЗША?

– Хутчэй за ўсё няма такога дакладнага здарэньня. Мяне ўвогуле дзівіць такая зьява, калі людзі могуць трымацца аддалена адзін ад аднаго і не фармаваць суполкі або натуральныя сувязі. Тлумачу, што я маю на ўвазе. Можна быць знаёмым з чалавекам ўсё жыццё і ня ведаць нават ці жанаты ён, ні разу ня бачыць ягонай хаты і ўвогуле, ня ведаць, што адбываецца ў ягоным жыцьці. Гэта менавіта той бар'ер, за якім людзі хаваюцца. Гэта і зьдзіўляе мяне, хоць з часам да ўсяго прызвычайваешся.

– Тут жа пытаньне: як вы лічыце, у чым каардынальная розніца паміж беларусамі і амэрыканцамі? І чаго асабліва беларускага не хапае Вам?

– Праўду кажучы, я люблю больш амэрыканцаў, таму што іхнае ўяўленьне аб сьвеце бліжэйшае да рэальнасьці. У іх ёсьць доступ да гісторыі, магчымасьці ў свабодным вывучэньні культуры, разьвітая самасьвядомасьць, яны ведаюць, чаго хочуць. У беларусаў жа ўяўленьне аб сьвеце надзвычай перавернутае. Колькі я бачыла людзей, якія атрымліваюць палітычны прытулак, маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія здольныя працаваць, але імкнуцца атрымаць усемагчымыя бэнефіты ад дзяржавы, атрымліваюць welfare (сацыяльная падтрымка), хоць, яшчэ раз паўтараю, ёсьць магчымасьць працаваць. І гэта мяне асабіста моцна закранае, бо гэтыя людзі хочуць узяць і нічога ня даць узамен.

– Можа гэта ўплыў камуністычнай ідэалёгіі савецкага пэрыяду?

– Не, я заўважаю ў беларусаў гэта ў большай ступені, чым, напрыклад, у расейцаў ці ўкраінцаў. Іншыя схільныя да гэтага ў значна меншай меры. Асабліва гэта праяўляецца ў пакаленьня, якое вырасла пры Лукашэнку.

І галоўная розьніца паміж беларусамі і амэрыканцамі – гэта шырыня сьветапогляду, успрыманьня сьвету як такога. У амэрыканцаў няма такіх бар'ераў, якія ўкараніліся ў галовах беларусаў. Мысьленьне нашых людзей выразна загнанае ў вызначаныя рамкі. Тут дзецям, магчыма, і не даюць такую базу ведаў, як гэта робяць у нас, але іх зь дзяцінства прывучаюць думаць над праблемамі і знаходзіць вырашэньне. Амэрыканская сыстэма навучаньня і сыстэма думаньня абсалютова іншыя, тут трэба разважаць.

– Пытаньне, ускосна зьвязанае з вашай прафэсіяй. Як Вы лічыце, дзе больш бюракратыі ў Беларусі ці ў ЗША?

– Скажам так. У Беларусі злосны бюракратызм, а тут бюракратызм, часьцей за ўсё, бывае з-за недахопу рэсурсаў.

– Ёсьць міт, што ўсе пасьпяховыя людзі пачыналі з пазыцыі мыйшчыка посуду. З якой працы пачыналі Вы?

– Я мыла прыбіральні ў спартыўным комплексе, куды пасьля мае дзеці хадзілі плаваць, нядоўга праўда. Пасьля працавала ў пякарні за 6 даляраў на гадзіну. Гэта быў мінімальны заробак.

– Амерыка – гэта краіна магчымасьцяў. На вашую думку, якіх?

– Ведаеце, у Пакістане ці дзе яшчэ ёсьць такія магчымасьці, якіх няма ў Амэрыцы. Гэта ўсё вельмі суб'ектыўна. Але калі параўноўваць менавіта зь Беларусьсю, то тут, безумоўна, ёсьць магчымасьці займацца тым, што падабаецца, рухацца наперад, разьвівацца, тут больш правоў і магчымасьцяй абараняць гэтыя правы.

– Зараз мне хочыцца зьвярнуць увагу на горад, у якім мы жывём. Скажыце, што больш за ўсё вам падабаецца ў Нью-Ёрку, і што Вас не задавальняе?

- Значыць, пачну зь негатыўнага. Не падабаецца мне шум, сьмецьце, вялізная колькасьць людзей. Іх тут нашмат больш, чым можа быць у прынцыпе. Таксама расчароўвае мяне адсутнасць прыроды, лесу, гор і г.д. Падабаецца ж разнастайнасьць культураў, якія суіснуюць і пастаянна ўзаемадзейнічаюць між сабою. Падабаецца энэргія Мангэтана, яна вельмі крэатыўная і натхняльная.

– Існуе думка, што Нью-Ёрк – гэта кіпячы кацёл, у якім усе варацца і з часам губляюць сваю арыгінальнасьць, індывідуальнасьць. І што ўсе крычаць пра ўяную свабоду і ўседазволенасьць, а на справе шмат абмежаваньняў амаль у кожнай сфэры жыцьця. Што Вы скажыце?

– Па-першае, няма ніякай неабходнасці губляць сябе, сваю індывідуальнасьць. Гэта залежыць толькі ад кожнага чалавека асобна. Прыстасавацца да культуры, у прынцыпе, не патрабуе адмаўленьня ад сваіх традыцыяў, сваёй індэнтычнасьці. Другая справа, што Нью-Ёрк мае шмат абмежаваньняў у сувязі зь вельмі рознай мэнтальнасьцю народаў, якія прысутнічаюць тут. Гэта як сацыяльная дамова – трэба ў нечым саступаць, бо інакш такой колькасці людзей немагчыма суіснаваць.

– Якія пажаданьні ці парады вы маглі б даць нашым землякам, якія ня так даўно прыехалі ў ЗША?

– Першае, спрабуйце паступаць вучыцца, нават калі ў вас сярэдні ўзровень ангельскай, не марнуйце дарэмна час на ўсялякія курсы паляпшэньня мовы, бо пры вучобе мова аўтаматычна разьвіваецца. Калі ўжо не атрымаецца паступіць, тады зьвяртайцеся да падрыхтоўчых курсаў.

Другое, нічога ня бойцеся, рабіце тое, што заплянавалі. Ня вельмі слухайце іншых. Калі я прыехала, мне пачалі казаць, што бізнэс свой тут ніколі не пачнеш, як шмат грошай трэба для гэтага, зь дзецьмі ўстаць на ногі тут неймаверна цяжка і г. д. Шмат "не рабі" – абмяжоўвае вашыя дзеяньні. Я паслухала ўсіх і зрабіла па-свойму, так як лічыла патрэбным. Іншыя наслухаюцца гэтых абмежаваньняў і ідуць працаваць мыйшчыкамі посуду гадамі і лічаць яшчэ, што яны добра ўладкаваліся. Адным словам, мая парада ня слухаць усе парады.

Трэцяе, не парушайце законы. Уяўленьне нашых людзей аб законах уражвае мяне як адваката. Магчыма, парушэньне некаторых законаў у Беларусі для многіх зьяўляецца нормаю, але трэба зразумець, што тут іншая краіна, іншы мэнталітэт, іншы ўзровень адказнасьці. Часта сутыкаюся ў практыцы, што людзі прыяжджаюць, набіраюць крэдытаў і потым іх не выплочваюць, некаторыя падрабляюць дакумэнты, шмат выпадкаў парушэньня іміграцыйных законаў. Таму раю, памятайце аб адказнасьці, аб выніках вашых учынкаў.

З Юліяй ЕЛІСЕЕВАЙ гутарыла Ганна ШАРКО

сьв. памяці Аляксандар МІЦКЕВІЧ
(15.11.1919 - 28.04.2015)



28 красавіка сёлета пайшоў з жыцьця выдатны актывіст беларускай грамады ў Амэрыцы, грамадзкі й рэлігійны дзеяч сп. Аляксандар Міцкевіч.

Сп. Алесь Міцкевіч, як называлі яго сябры і знаёмыя, нарадзіўся ў вёсцы Мікалаеўшчына Стаўпецкага павету, адкуль паходзіць Якуб Колас, пляменьнікам якога і быў Алесь Міцкевіч. Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў родных мясьцінах. У годзе ён скончыў польскую 7-гадовую школу, працаваў на гаспадарцы і браў удзел у нацыянальным беларускім руху. У 1939 годзе быў мабілізаваны ў польскае войска, браў удзел у баёх пад Модлінам, быў паранены. Затым, пасьля спыненьня вайсковых дзеяньняў, перабраўся за Буг у Беларусь, дзе ўжо былі Саветы. Скончыў 6-месячныя настаўніцкія курсы ў Стоўбцах. Працаваў настаўнікам пачатковых школаў на Стаўпеччыне.

У годзе сп. А. Міцкевіч выехаў на чужыну, браў удзел у беларускім грамадзкім жыцьці у Аўстрыі й Францыі. У 1955 годзе на запрашэньне дзядзькі Міхася перебраўся за акіян, і сьледам за Алесем прыехаў ягоны старэйшы брат Валянтын.

Сп. Алесь Міцкевіч быў адным са стваральнікаў і кіраўнікоў Беларуска-Амэрыканскага Дапамогавага Камітэту. Таксама быў сябрам і старшынём (1982 – 1997) Нью-Ёрскага аддзелу (БАЗА). Зьяўляўся радным, а пазьней старшынём (1979 – 1981) Царкоўнай Рады пры Катэдральным саборы сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне.

Сп. Алесь Міцкевіч быў сябрам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

На працягу многіх гадоў сп. А. Міцкевіч распаўсюджваў газэту "Беларус"(Нью-Ёрк) па Злучаных Штатах і па сьвеце. Ён заснаваў і выдаваў двухтыднёвік аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку "Весткі й Паведамленьні" (1982 – 1997), які працягвае штомесяц выходзіць і цяпер. Пазьней для жыхароў Нью-Ёрку й ваколіцаў ён друкаваў і за свой кошт рассылаў машынапісны "Цыркуляр".

Сьветлая памяць ахвярнаму і адданаму дзеячу беларускай грамады ў Злучаных Штатах.

Віталь ЗАЙКА

Чарнобыльскі мітынг на Мангэтане

У нядзелю, 26 красавіка, адбыўся мітынг, прысьвечаны 29-гадавіне Чарнобыльскай атамнай катастрофы. Мітынг быў ладжаны Беларуска-Амэрыканскім Згуртаваньнем "Пагоня" і праходзіў насупраць штаб-кватэры Арганізацыі Аб'едналых Нацыяў на Першай Авэню пры 43-й вуліцы.

Напачатку мітынгу выступіў старшыня Згуртаваньня сп. Віталь Зайка, які распавёў пра мэты мітынгу, якія ўлучаюць прыцягненьне ўвагі да становішча беларусаў, якія дасюль жывуць на землях, забруджаных радыёактыўнымі рэчывамі і не артымліваюць адэкватнай дапамогі ад цяперашніх уладаў у Беларусі. За апошнія 25 год фінансаваньне праграмаў, зьвязаных зь ліквідацыяй наступстваў Чарнобыльскай аварыі, скарацілася ў чатыры разы. Лукашэнка аб'явіў, што на забруджаных землях можна вырошчваць чыстую сельгаспрадукцыю, і што наагул там можна нармальна жыць і працаваць. У гэты ж час амаль 400 населеных пунктаў былі пазбаўленыя статусу паселішчаў у зоне радыяцыйнага забруджаньня з адпаведным спыненьнем дапамогі й ільготаў для жыхароў. Яшчэ раней былі амененыя ільгот для ліквідатараў, тых хто браў удзел у працах па дапамозе ліквідацыі наступстваў аварыі ў непасрэднай блізкасьці да рэактару і ў зонах з высокім узроўнем радыяцыі.



Мары Асана з удзельнікамі мітынгу

Другою мэтаю мітынга ёсьць прыцягненьне ўвагі да пабудовы на Астравеччыне атамнай станцыі, якая адбываецца па расейскім праекце і на расейскія крэдыты. Але замест дасягненьня энэрганезалежнасьці Беларусі, аб чым гучна заяўлялі прадстаўнікі рэжыму, Астравецкая АЭС, праект якой ня быў адкрыта і прынародна абмеркаваны, толькі глыбей зацягне краіну ў залежнасьць ад Расеі, якая надалей будзе загадваць атамным палівам, адходамі, запчасткамі й г.д. А галоўнае – праект не зьяўляецца, на думку многіх экспэртаў, дастаткова бясьпечным і экалягічным.

Затым перад прысутнымі выступіла колішняя ўдзельніца праекту "Дзецям Чарнобылю" з Японіі сп-ня Мары Асана.

заканчэньне на 7-й бач.

Чарнобыльскі мітынг

заканчэньне з бачыны 6

Яна зрабіла ўводную прамову па-беларуску, адзначыўшы, што любіць беларускіх людзей і таму вывучае беларускую мову. Сп-ня Асана распавяла, як яна поруч зь іншымі японцамі, прымала ў сябе дома чарнобыльскіх дзяцей, якім была дадзеная мажлівасьць правесьці месяц на аздараўленьні ў Японіі, у асяродзьдзі, чыстым ад радыяцыі, спажываць чыстыя харчовыя прадукты. Сп-ня Асана на свае грошы ня толькі прымала цягам 10 год беларускіх дзяцей, але і езьдзіла да іх у забруджаныя радыяцыяй вёскі Брагінскага, Хойніцкага, Кармянскага, Чэрыкаўскага раёнаў і падтрымлівала матэрыяльна і маральна сем'і жыхароў, што апынуліся ў няпростай сытуацыі, калі дзяржава стала рабіць для іх меней і меней. Неўзабаве ўрад Лукашэнкі спыніў дабрачынную дзеянасьць праз японскія арганізацыі, але сп-ня Амана працягвала гэта рабіць у прыватным парадку. Яна таксама адзначыла небясьпеку атамных станцыяў, што ячшэ раз паказала аварыя на АЭС у Фукусіме, дзе ўрад таксама, як савецкі ўрад у 1980-я, замоўчвае вынікі аварыі й не аказвае належнай дапамогі пацярпелым. Сп-ня Асана бярэ ўдзел у антыатамным руху ў Японіі.

Затым прысутныя сталі выгукаць лёзунгі: "Не – новаму Чарнобылю", "Не – АЭС у Беларусі", "Беларусь – так! Лукашэнка – не!" Прысутныя трымалі нацыянальныя сьцягі, а таксама плякаты, прысьвечаныя падзеі.

Віталь ЗАЙКА



Імпрэза ў Нью-Брансўіку

заканчэньне з бачыны 2

новую навалу, што ідзе, як і заўсёды, з Усходу, з Расеі, якая цяпер набірае штораз больш нахабства і агрэсіі ў выніку той беспакаранасьці, якую дапускаюць недальнабачныя кіруючыя колы і палітыкі Вольнага Сьвету".

Сп. Пазьняк адзначыў, што сытуацыя цяпер вельмі сур'ёзная, бо Беларусь фактычна безабаронная перад расейскай агрэсіяй па крымскім сцэнары, перад сытуацыяй, да якой давялі 20 год лукашэнкаўскага антынацыянальнага панаваньня ў Беларусі. "Толькі рашучасьць нашых людзей, толькі салідарнасьць і гатовасьць нават са зброяй у руках супрацьстаяць расейскай агрэсіі можа спыніць захопніцкія пляны Пуціна, які ўжо бачыць Беларусь у сваёй кішэні і, напэўна, ня лічыць яе акупацыю складанай задачай. Але ён можа крэпка памыліцца, бо беларусы ў адказныя моманты гісторыі былі здольныя аб'яднацца і выказаць волю да змаганьня і да перамогі. Да гэтага мусім быць гатовыя і ўсе мы".

Затым з прывітаньнем ад БАЗА выступіла старшыня галоўнай управы Ганна Сурмач. Яна павіншавала прысутных з нацыянальным сьвятам і адзначыла, што важна не забывацца пра супрацоўніцтва паміж усімі беларускімі арганізацыямі, хоць у гэтай справе не заўсёды складаецца найлепей, але працаваць і спрабаваць трэба, і гэта мусіць быць асноўным кірункам працы поруч з захадамі па дапамозе Бацькаўшчыне.

Напрыканцы ўрачыстай акадэміі была прынятая рэзалюцыя ўдзельнікаў сьвяткаваньня ў Нью-Брансўіку.

Затым прайшоў сьвяточны канцэрт, у якім прынялі ўдзел Валянціна Пархоменка, Алесь Казак і Вольга Казак-Анлар. Вольга выканала шэраг сваіх, стаўшых ужо ўлюбёнымі, песень, у тым ліку "Спытай у неба" і "Край беларускі", а таксама свае хіты "Белая-Белая", "Чыстая-Сьветлая", якія выклікалі гарачы водгук у прысутных. Вольга, як і яе бацькі, Валянціна і Алесь, надзвычай эмацыйна і ўзьнёсла правялі канцэрт, выклікаўшы падзяку і розгалас у душах прысутных на імпрэзе. Моладзь выходзіла танчыць пад гукі музыкі й сьпеваў.

Затым перад прысутнымі выступіў знакаміты паэт і музыка Сяржук Сокалаў-Воюш, цёпла сустрэты прысутнымі. Ён выканаў свае слынныя песьні "Беларусь мая" (Аксамітны вечар), "Сьвятая Ганна" ды іншыя запамінальныя творы.

У завяршэньне імпрэзы прагучэла песьня-гімн "Магутны Божа" і беларускі нацыянальны гімн "Ваяцкі марш"у выкананьні трыё сям'і Казакоў, якім падпявала ўся заля.

На імпрэзе прысутнічала больш за 70 чалавек, і ўсе адзінадушна адзначалі яе добрую падрыхтоўку і цудоўныя выступы ўдзельнікаў канцэрту, а таксама пажадалі, каб такія імпрэзы праводзіліся як часьцей.


Падзяка за дагляд фінансавых пытаньняў і кветкоў належыцца сп. Янку Грышкевічу, а за складаньне праграмы й агульнае кіраваньне – старшыню БАЗА ў Нью-Джэрзі Юрку Азарку.

Віталь ЗАЙКА

“Галгатня пра ЗыШыА”

Цывілізацыя 25-га кадру

Тэарэтычны падзел на стары і новы сьвет, на Эўропу – Старажытную Грэцыю і Амэрыку – Рымскую імпэрыю ўжо даўно неактуальны. І канец іхны, насуперак гістарычным аналёгіям, можа быць вельмі падобны. Усе мы жывем сёньня адным глябальным жыцьцём. Эўропа зусім не ўстаяла даўжэй перад дэградацыяй за Амэрыку, а ў шмат якіх аспэктах нават наадварот – яе перагнала. І тут, і там дзіцячая парнаграфія па тэлебачаньні сталася нормай. У амэрыканскіх пэдафілаў “National Dance Competition KAR”, у эўрапейскіх Дзіцячае Эўрабачаньне. Вульгарна размаляваныя першаклясьніцы выконваюць афрыканскі пракрэацыйны танец, бацькі вішчаць ад захапленьня і пляскаюць разам з астатняй часткай захопленай публікі. У, здавалася б, ад’ізаляванай ад “цывілізаванага” сьвету Расеі дакладна тое ж самае, толькі яшчэ з дадаткам уласнай пярчынкі.



У кожным эўраштаце па сваім Джэры Спрынгеры, якія і там зь лёгкасьцю знаходзяць сваіх донараў, каб пераціралі на публіцы тое, пра што раней сароміліся гаварыць нават у зацішшы свайго дому. Усе гэтыя падрыгваньні з зоркамі, бясконцыя чэргі талентаў, няспынныя кухонна-цырульняныя рэвалюцыі. Можа скласьціся памылковае ўражаньне, што людзі павінны толькі сьпяваць, танчыць, гатаваць і наперамена жэрці і худзець, а калі ўсе гэтыя цыклі пройдзеныя, то можна яшчэ даць адзін аднаму па мордзе, пад захоплены рык публікі ў студыі. Здавалася б, жывем у адносна нядрэнны час, але хутка можам пераканацца, што гэта толькі ілюзорнае ўражаньне. Такога падзеньня гісторыя чалавецтва магчыма дагэтуль і ня бачыла.

На затручваньне, вядома, патрэбныя немалыя сродкі. Каб мець магчымасьць трансьляваць усё большую колькасьць рэклямы, а ў некаторых амэрыканскіх станцыях яна складае чвэрць этэру, хітрыя тэлевізіёншчыкі пачалі прысьпешваць фільмы. Невялікае паскарэньне дае 2 хвіліны на кожную гадзіну стужкі.

Здавалася б, у чым праблема – адключыў тэлевізар, пачаў чытаць кніжкі. Адзіны актульны цывілізацыйны падзел вядзе лінію паміж тымі, што глядзяць тэлебачаньне і тымі, што чытаюць кніжкі. Спалучыць адно з другім немагчыма, бо тады людзі чытаюць толькі тыя кніжкі, якія раней ім паказалі па тэлевізару. Застаецца выкінуць тэлевізар вон, разьбіць спадарожнікавую антэну і спаліць дэкодэр. Ад’ізаляваць ад гэтага паскудзтва сябе і сваіх блізкіх. Іншага выйсьця няма. Цывілізацыйная вайна пачалася ня ўчора. Яе проста не аб’явілі.

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíí³:

Н. Аўдзейчук 60
С. Багданава 60
А. Грыневіч 60
А. Каляда 60
В. Каляда 60
П. Куроўскі 60
А. Савінскі 60
А. Тавакелян 60

Усім шчыры дзякуй!

*Паважаныя **С. Казачок, І. Кумец, Н. Лазоўская, А. Петрусевіч** і **А. Цяценькін**, калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя
Viktar Yedzinovich.

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца ў суботу **9-га траўня 2015 году** на Мангэтане ў **Доме Маракоў** па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**. Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад **Union Square** па **15-й вуліцы** на скрыжаваньні з **Irving Place**.*

Заля на 2-м паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

----

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў,ладжаных арганізацыяй, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку **pahonia.com***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

Н. Аўдзейчук 30
А. Грыневіч 30
В. Каляда 30
Я. Кацярыніч 30
А. Копат 30
П. Куроўскі 30
А. Савінскі 30
А. Тавакелян 30

Шчыры дзякуй!

Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі ($30) на адрас:

Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **“Весткі”** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня “Пагоня” **Viktar Yedzinovich**.*

*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку **www.e-krama.com***